ORANGOTANGO

ДАПАМОЖНІК

# КАЛЕКТЫЎНАЕ КРЫТЫЧНАЕ КАРТАВАННЕ

## Праваднік па супольным абмеркаванні і змяненні нашых тэрыторый штодзённасці



# ДЛЯ ЧАГО МОГУЦЬ СЛУЖЫЦЬ КАРТЫ?

*"Улада ўплывае на картаграфію. [...] ажыццяўляецца з дапамогай картаграфіі". (J B Harley, Deconstructing the Map, Cartographica, Vol. 26 No. 2 Summer 1989 p. 1-20).*

Ад самага свайго з'яўлення карты былі моцна звязаныя з адносінамі ўлады і працяглы час служылі амаль выключна тым, хто мае ўладу (манархам, ваенным, царкве і г.д.), як каштоўная і эксклюзіўная прылада кантролю і паглыблення сферы іхняга ўплыву.

З тых часоў карты ў разнастайных формах і частках сталі бясплатна даступныя вялікай колькасці насельніцтва праз Інтэрнэт; тым не менш, яны застаюцца толькі адлюстраваннем аднаго пункту гледжання на прастору. Аднак нельга разгледзець усю складанасць прасторы праз адну перспектыву. Прасторы не аднамерныя, прыродныя і нерухомыя структуры, яны канструююцца падчас штодзённага суіснавання, яны дынамічныя і шматмерныя.




Класічная праекцыя Меркатора (без Антарктыды), дзе, напрыклад, Грэнландыя (1) (2.166 тыс. км²) паказана большай за Паўднёвую Амерыку (2) (17.832 тыс. км²). Крыніца: Wikipedia.

Гэтая сацыяльная каструкцыя не выпадковая, яна падпарадкоўваецца дамінуючым нормам і правілам асобнага грамадства. Гегеманічныя дыскурсы кіруюцца інтарэсамі і ўладай, і прадукуюць як грамадскую, так і прасторавую іерархію. «Традыцыйныя» карты часта адлюстроўваюць гэтыя іерархіі.

У дадзенай брашуры часта выкарыстоўваецца слова «партысіпатыўны». Яно ўтворана ад ангельскага participate (удзельнічаць). Тут пад партысіпатыўнасцю разумеецца актыўны ўдзел усіх чальцоў групы ў аналізе праблем, прыняцці рашэнняў, планаванні супольных дзеянняў, ацэнцы (самаацэнцы) атрыманых вынікаў.Партысіпатыўнае картаванне можа дапамагчы лепш зразумець гэтую грамадскую дынаміку і ейныя супярэчнасці. Непасрэдны і шчыры абмен суб'ектыўнымі бачаннямі і ўспрыняццямі прастораў пашырае нашае разуменне прасторы, якая нібыта з'яўляецца аднолькавай для ўсіх. Прасторы, а з імі і пражытыя рэчаіснасці, прадукуюцца і ўзнаўляюцца ва ўзаемадзеянні з гістарычным развіццём, а таксама з досведам кожнага з нас.

Партысіпатыўнае картаванне свядома займаецца штодзённымі прасторамі жыцця і дзеянняў людзей. Падчас працэсу супольнай сэнсібілізацыі (павелічэння чуллівасці) яно можа стымуляваць больш глыбокую рэфлексію і абмен досведам і светапоглядамі на сацыяльна-прасторавыя залежнасці жыццёвага асяроддзя.

Праз "крытычныя" карты ствараюцца альтэрнатыўныя рэпрэзентацыі і эмансіпаваныя прасторы дзеяння і гульні для аўтаномнага, супраціўленчага і субкультурнага жыцця.
Пачынаючы з 1970-х гадоў, назіраюцца шматлікія прыклады крытычнай картаграфіі, асабліва ў Лацінскай Амерыцы.
Сыходзячы з крытыкі зместу традыцыйных карт і іхных рэпрэзентацый, праца па гэтых "крытычных" картах вядзецца перадусім у кантэксце новых сацыяльных рухаў.




"America Invertida" ("Перавернутая Амерыка"). Торэс Гарсія, 1973

# ДЛЯ ЧАГО МОГУЦЬ СЛУЖЫЦЬ КАРТЫ?

Крытычныя карты, якія разумеюцца як графічнае адлюстраванне палітычных і грамадскіх падзей, адлюстроўваюць разнастайныя пункты гледжання акурат тых людзей, якія традыцыйна выключаны з працэсаў прыняцця рашэнняў. У гэтым разуменні карты служаць сродкам палітычнай адукацыі, а таксама прыладай палітычнай практыкі сацыяльных рухаў.

На дадзены момант "картаграфія супрацiву" практыкуецца, напрыклад, аргентынскім калектывам мастакоў/чак-актывістаў/к Iconoclasistas пад назвай "mapeo colectivo" («калектыўнае картаванне»).
У Бразіліі "сацыяльная картаграфія", якая пачалася з рэгіёну Амазоніі, ўяўляе вялікую цікавасць, дапамагаючы мясцовым грамадам удакладніць аспекты сваіх калектыўных ідэнтычнасцяў і вызначыць свае тэрыторыі.

Аднак працэсы партысіпатыўнага крытычнага картавання могуць таксама рабіць вялікі ўнесак у мясцовую палітычна-культурную працу, каб прааналізаваць сацыяльныя няроўнасці, выпрадукаваць калектыўныя веды і падтрымаць мясцовыя сацыяльныя рухі. Дапаможнік "Калектыўнае крытычнае картаванне" не мусіць разумецца толькі як прылада для аналізу, ён мэтанакіравана і свядома спрыяе паглыбленню ў палітычную практыку для змянення існуючай рэчаіснасці.




Праекцыя Фулера, на якой свет не падзелены на верх і ніз, а кантыненты (напрыклад, Грэнландыя (1) і Паўднёвая Амерыка (2)) адлюстраваныя згодна з дакладнай плошчай (параўнайце з малюнкам на ст. 2). Крыніца: http://commons.wikimedia.org, аўтар Эрык Габа, карыстальнік wikimedia commons Sting.

# КАРТАВАННЕ
## ХТО МОЖА ІМ ЗАЙМАЦЦА?



Кожны(ая) можа прыдумаць свае карты. І карты - гэта не толькі планы гарадоў, на іх можна адлюстроўваць зусім розныя тэрыторыі: ваш квартал, вашую вёску, вашыя сацыяльныя сувязі, вашыя страхі і ўяўленні будучыні, усё, што вам захочацца усё, чаго вам не хапае для поўнага шчасця. Вашыя магчымасці неабмежаваныя.

## ШТО ТАКОЕ
# КАЛЕКТЫЎНАЕ КАРТАВАННЕ?

Гэта вельмі добрая і карысная прылада, што дапамагае нам дасягнуць калектыўнага разумення акрэсленай тэрыторыі. Інфармацыю для картавання мы атрымліваем у прасторы гарызантальнага ўзаемадзеяння, накіраванага на распрацоўку ведаў і іх адлюстраванне на агульным дапаможным сродку – на карце. Такая карта павінна быць партысіпатыўным сродкам, які ставарае платформу ведаў пра розныя рэчаіснасці на аснове нашых штодзённых назіранняў. І пры гэтым мы ўсе з'яўляемся эксперт(к)амі.

Калектыўнае картаванне функцыянуе асабліва добра, калі яго можна ўбудаваць ва ўжо існуючы групавы працэс. Арганізатарскія выдаткі і выдаткі часу на планаванне і ажыццяўленне картаграфічнага працэсу, а перадусім на пазнейшае пераасэнсаванне зробленага могуць моцна вар'іравацца. Цэнтральнае значэнне ў калектыўным стварэнні картаў мае супольны працэс рэфлексіі, таму нельга пераацэньваць карту як непасрэдны вынік працы.

# ШТО ТАКОЕ КРЫТЫЧНАЕ КАРТАВАННЕ?

Крытычныя карты бяруць пачатак з крытыкі традыцыйных карт і разумеюцца як рэпрэзентацыі сацыяльна-крытычных перспектыў. Крытычныя карты могуць разумецца або «толькі» як адна з магчымасцей палітычных выказванняў, або як прылада палітычнай практыкі.




Крытычная карта памежжа Марока і Іспаніі, якая адлюстроўвае сітуацыю мігрантаў з Афрыкі пры спробе трапіць у Еўрапейскі Саюз (Крыніца: fadaiat.net)




Фрагмент "Карты акцый Castor 2011" (Крыніца: www.castor2011.org)

# ЯК АРГАНІЗАВАЦЬ ВАРШТАТ

## ПА КАЛЕКТЫЎНЫМ КРЫТЫЧНЫМ КАРТАВАННІ?



Прадстаўляем вам шэраг крокаў, які дапаможа вам ажыццявіць працэс картавання. Усё гэта вы можаце зрабіць за дзень, за тыдзень або за месяц. Працягласць картаграфічнага працэсу залежыць ад таго, што вы збіраецеся адлюстроўваць на карце, з кім вы гэта робіце, і колькі часу вы на гэта маеце. Калі гаворка ідзе пра змястоўна і ясна структураваны, канкрэтны і прадказальны план для ўжо даўно дзейснай групы, тады можа хапіць аднаразовага варштату.

У іншым выпадку трэба запланаваць варштат на больш працяглы час, бо часам працэс можа зацягнуцца нават на год. Такое можа здарыцца, напрыклад, у выпадку, калі падчас суправаджэння бягучага картаграфічнага працэсу трэба адлюстраваць, што змяняецца ў канкрэтнай прасторы, або як змяняецца ўспрыманне гэтай прасторы ўдзельнікамі працэсу.

Вы бачыце, што гэты дапаможнік можа быць толькі арыентырам ў мностве мажлівасцей і сфер працы калектыўнай крытычнай картаграфіі. Таму варта прыстасоўваць да вашага кантэкста розныя спецыфічныя крокі, якія адпавядаюць вашым патрэбам - глядзіце па сітуацыі: ці то вы назіраеце за зменамі ў вашым раёне горада, ці то паказваеце палі з генетычна мадыфікаванымі раслінамі, ці то хочаце звязаць салідарна-эканамічныя структуры вашага рэгіёну… Магчымасці неабмежаваныя.



# ЯК АРГАНІЗАВАЦЬ ВАРШТАТ ПА КАЛЕКТЫЎНЫМ ГРАФІЧНЫМ КАРТАВАННІ?

**1** Спачатку трэба зрабіць для ўсіх удзельнікаў кароткія ўводзіны ў тое, што запланавана падчас варштату, чаго можна ад яго чакаць і што чакаецца ад саміх удзельнікаў. Азнаямленне з гнуткім раскладам, які прадугледжвае дастаткова часу на перапынкі і магчымыя энэрджайзеры*, будзе таксама карысным у якасці сумесных падлікаў неабходнага часу і выпрацоўкі тэматычнага плану. Для поспеху варштату вельмі важна, каб удзельнікі разумелі сябе як прымальнікаў рашэнняў і каб тэматыка варштату адпавядала іхнім патрэбам і цікавасцям.



Скрынка з прыладамі, неабходнымі для варштату

**2** Далей вам трэба дамовіцца ў групе наконт таго, якія тэматычныя напрамкі вы выбераце для будучай карты. Тут важна памятаць, што кожны феномен аб'ядноўвае розныя аспекты (напрыклад, сацыяльныя, экалагічныя, культурныя і эканамічныя).
Чым лепш вам гэта будзе зразумела, тым лепей ў вас атрымаецца варштат, а потым і яго аналіз і падвядзенне вынікаў. Акрамя таго, вельмі важна, каб вы пагадзіліся наконт аднаго прасторавага фокуса - ці то гэта будзе ваш горад, ці то ваша вёска, ці то ваша вуліца, і каб вы добра ўсведамлялі, хто будзе карыстацца вашай картай.

**3** Калі колькасць удзельнікаў у групе перавышае 10 чалавек, пажадана, каб вы падзяліліся на больш дробныя групы.

*Энэрджайзер - кароткая гульня або іншая супольная актыўнасць, накіраваная на тое, каб скінуць стому і абстрагавацца падчас працяглага працэсу.

**4** Калі ёсць магчымасць, разам з іншымі ўдзельнікамі вы можаце зрабіць азнаямляльны тур па выбраным раёне, каб яшчэ раз добра ўсвядоміць сабе фрагмент рэчаіснасці, які вы хочаце адлюстраваць на сваёй карце, а таксама пафатаграфаваць яго.



Затым ідзе цэнтральны элемент варштату, **5** калі вы разам збіраеце на вялікім аркушы паперы або кардону ўсю інфармацыю, якая вам здаецца вартай увагі для выбранай тэмы. Пажадана працаваць з надрукаваным або намаляваным "спрошчаным" планам горада (агульны чарцёж з некалькімі апорнымі пунктамі).

Акрамя таго, мае сэнс занатаваць усе нібыта другасныя каментары, жарты, аповеды, а таксама газетныя артыкулы, флаеры і інш., каб потым дадаць іх на карту падчас падвядзення вынікаў.

За вамі застаецца выбар: карыстацца традыцыйнымі ўмоўнымі знакамі або прыдумаць іх самастойна. Першы варыянт ў запале барацьбы з'яўляецца больш хуткім, тэматычна сфакусаваным, прадказальным і таму аблягчае падвядзенне вынікаў і фінальную частку картавання, але патрабуе больш інтэнсіўнай падрыхтоўкі. Другі варыянт займае больш часу падчас самога варштату і яго фінальнай часткі, аднак прапануе больш высокі ўзровень вольнага аздаблення і ўдзелу ўсіх членаў групы. Акрамя таго, гэта спрыяе лепшаму ідэнтыфікаванню ўдзельнікаў з сімваламі, а таксама з картай увогуле. Камбінацыя абодвух метадаў таксама магчымая.




Калектыўнае картаванне з агульным чарцяжом (зверху) і сімваламі (знізу).

**6** Калі вы папрацавалі ў малых групах, на гэтым узроўні прапануецца прэзентаваць пытанні для абмеркавання і інфармацыю ад ўсіх груп на агульным сходзе і, у ідэале, перанесці ўсё гэта на агульную карту.



Варштат "Сацыяльная картаграфія" з сялянамі, што практыкуюць агульнае карыстанне з ямлёй. Паўднёвая Бразілія, 2010

**7** Цяпер з ўсяго хаосу інфармацыі, стрэлак, анекдотаў і крамзолей паспрабуйце згуртаваць асобныя аспекты па тэматычных блоках, якія вы потым хочаце адлюстраваць графічна (ў выглядзе ўмоўных знакаў).

Калі будзе здавацца немагчымым намаляваць пэўныя блокі, паглядзіце на ўкладцы некалькі прыкладаў, якія могуць вам служыць у якасці натхнення. Калі і там вы нічога для сябе не знойдзеце, паспрабуйце адлюстраваць пэўныя тэмы на маленькіх тэкставых палях карты.
Дадаткова вы можаце ўставіць розныя графічныя элементы (стрэлкі, рысы, каляровыя паверхні і г.д.), каб зрабіць карту больш зразумелай. Калі скончыце гэта, надыходзіць час скласці тлумачэнні для вашай карты, а таксама аздобіць і ўзбагаціць яе цытатамі, здымкамі, малюнкамі і інш.



Картаванне берлінскіх абшчынных гародаў. 2011

**8** Калі ў вас застаецца больш за дзень часу, мае сэнс зрабіць першы нарыс карты ўсёй групай, абмеркаваць яго і пры неабходнасці яшчэ раз яго перагледзець і прадумаць.

**9** У канцы вам належыць вырашыць, ці будзе карта, якая атрымаецца падчас варштату на паперы, з'яўляцца канчатковым прадуктам, або вы зробіце канчатковае мастацкае афармленне для друкаванай версіі, або запампуеце электронную версію карты ў Інтэрнэт. Мы будзем удзячныя за спасылку, калі ваша карта з'явіцца ў Інтэрнэце!




Картаванне "Салідарная эканоміка". Цюбінген, 2011




Карта горназдабываючых мегапраектаў ў Аргентыне і супрацьдзеяння ім (фрагмент). Крыніца: iconoclasistas.com.ar

Нават калі друкаваная або электронная версія карты ўжо цешыць вока, не варта забываць, што карта - гэта толькі адна частка з сумарнай дынамікі групы, і ні ў якім разе не абавязкова разглядаць яе як дасягнуты канчатковы вынік.

Згодна з дэвізам "Наша мэта – працэс", падчас крытычнага калектыўнага картавання ідзе абмеркаванне, сэнсібілізацыя і папаўненне ведаў, якія насамрэч маюць большае значэнне, чым сама карта.

## ORANGOTANGO

Калектыў Orangotango разумее сябе як адкрытая, стракатая і вольная платформа для актывістаў(ак), навукоўцаў і мастакоў(чак).

Каб дасягнуць роўных правоў для ўсіх, а таксама экалагічна бяспечнага ладу гаспадаркі і жыцця, мы імкнемся да творчага абмену формамі супрацы і самавыражэння. Мы дэкларуем салідарнасць з усімі формамі нізавой арганізацыі, якія знішчаюць межы і шукаюць выйсце з эксплуататарскіх і прыгнятаючых механізмаў капіталізму і неалібералізму.
Больш інфармацыі і спасылак глядзіце на сайце ***www.orangotango.info***

Гэты дапаможнік па арганізацыі варштатаў па калектыўным крытычным картаванні блізкі да падручніка "mapeo colectivo", распрацаванага калектывам Iconoclasistas і даступнага для запампоўкі на www.iconoclasistas.com.ar. Вялікі дзякуй за падтрымку і каштоўную падтрыхтоўку Іконакласістам з Буэнас-Айраса і Карласу Хуліо Санчазу з Кардобы за малюнкі!

Мы атрымалі натхненне ў тым ліку падчас варштатаў Nova Cartografia Social разам з UNI Curitiba (Бразілія), ад La Casita (Аргентына), ад праекта America Latina Cooperativa/MoveMento (Лацінская Амерыка) і з Asociacion Campesina de Antioquia (Калумбія).

**www.orangotango.info**

**Abrazos y saludos para nuestr@s compañer@s! Que sigamos tejiendo lazos de fraternidad y solidaridad en la construcción por un nuevo amanecer!**

**Распаўсюджваецца па ліцэнзіі Creative Commons. Дазваляецца неабмежаванае бясплатнае некамерцыйнае выкарыстанне пры захаванні пазначэння аўтарства. Вытворныя працы мусяць распаўсюджвацца на аналагічных умовах.**

Па задумцы Іконакласістаў мы хочам распаўсюдзіць гэты падручнік, каб спрыяць з'яўленню крэатыўных стратэгій супрацы несправядлівасцям сучаснага грамадства і гегеманічным ідэалогіям. Такім чынам, распаўсюджвайце гэты падручнік, адукоўвайцеся самі, вучыце іншых, гуртуйцеся ў групы і пачынайце картаваць!

# УСЯЛЯКІЯ РОЗНАСЦІ ДЛЯ ЛЕГЕНДЫ




«Сардэчна запрашаем» Таму, што няпроста паказаць праз сімвалы, часта знаходзіцца прыдатнае месца на таблічках. І чаму карта не павінна быць шматмоўнай?

На гэтых двух старонках дапаможніка мы падаем шэраг умоўных знакаў, якія могуць стаць крыніцай натхнення ці ўзорамі для капіявання / сканавання.

Сімвалы на гэтай старонцы ўзніклі на семінары па картаванні берлінскіх абшчынных гародаў (глядзі старонкі 8 і 9). Карта, якая паўстала тамсама, знаходзіцца на адваротным баку.



Кампост



Размнажэнне насення



Палітычныя агароды



Пчалярства



Праблема смецця



Водакалонка







Выкарыстанне стрэлак і дыялогавых «бурбалак» дазваляе добра паказаць абмен, сувязі і меркаванні.




Гатуюць ежу / пякуць




У адкрытым доступе




Праблемы




Продаж

Паказаным тут сімвалам знайшоўся ўжытак у нашым зборніку «Прасторы салідарнасці і кааператыўныя перспектывы [Solidarische Räume und kooperative Perspektiven]» (AG Spak, 2010).



Месца для дыскусіі




Крэатыўныя формы пратэсту



Салідарная сельская гаспадарка



Самакіраваны цэнтр



Відэа-актывізм



Кааперацыя




Салідарная эканоміка



Месца для крытычнай рэфлексіі

Наступныя ўмоўныя знакі паўсталі падчас семінара па картаграфаванні з прадстаўні(к/ц)амі розных калектываў («Аазіс» на фестывалі Fusion 2012).



Супрацоўніцтва без межаў



Калектыў па правядзенні вечарынак



Крытыка капіталізму



ЛГБТ, квір



Альтэрнатыўныя формы супольнага пражывання



Адкрытая майстэрня



Народная кухня



Адукацыйныя пратэсты